УДК 303.683:7.046.1(48)

***Ю. С. Барадзін,***
*аспірант кафедры культуралогіі*
*ўстановы адукацыі «Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт*
*культуры і мастацтваў», г. Мінск, Беларусь*

# ГЕНЕАЛОГІЯ ЯК МЕТАД ВЫВУЧЭННЯ БЕЛАРУСКАЙ І СКАНДЫНАЎСКАЙ МІФАЛОГІІ

**Анатацыя.** Мэтай дадзенага артыкула з'яўляецца паказ узаемасувязі генеалогіі ў філасофіі Ф. Ніцшэ і М. Фуко з беларускай і скандынаўскай міфалогіяй. Аб'ектам даследавання выступаюць генеалагічныя міфы. У публікацыі аўтар звяртаецца да генеалогіі ўлады, этычнага суб'екта, паходжання і радаводу беларускіх і скандынаўскіх дэміургаў. Праз філасофскі светапогляд Ніцшэ і Фуко праводзіцца далейшае даследаванне, а таксама параўнальны аналіз беларускіх і скандынаўскіх міфаў.

**Ключавыя словы:** генеалогія, міфы, этыка, паходжанне, радавод, першапродак, першабог, сваяцкія сувязі.

***Y. Borodin,***
*Postgraduate student of the Department of Cultural Studies of the*
*Educational Institution "The Belarusian State University*
*of Culture and Arts", Minsk, Belarus*

# GENEALOGY AS A METHOD IN BELARUSIAN AND SCANDINAVIAN MYTHOLOGY

**Abstract.** The purpose of this article is to show the relationship of genealogy in the philosophy of F. Nietzsche and M. Foucault with Belarusian and Scandinavian mythology. Genealogical myths are the object of research. In the publication, the author refers to the genealogy of power, an ethical subject, the origin and genealogy of the Belarusian and Scandinavian demiurges. The author carries out further research and comparative analysis of the Belarusian and Scandinavian myths through the philosophical worldview of Nietzsche and Foucault.

**Keywords:** genealogy, myths, ethics, origin, pedigree, first ancestor, first god, family ties.

Генеалагічныя міфы – міфы аб радаводзе, паходжанні дэміургаў, а таксама адносінах сваяцтва паміж імі. Генеалогія як частка міфалогіі займае важнае месца ў міфалагічным светапоглядзе, паколькі апісвае з'яўленне першапродкаў багоў, ад якіх ідзе пачатак і працяг роду. Паколькі вікінгі верылі ў

сваё паходжанне ад Одзіна, адчуваючы сябе сынамі і спадчыннікамі Усебацькі, а беларусы бачылі сябе нашчадкамі і ўнукамі Дажбога (бога Сонца), у генеалагічнай міфалогіі як багі, так і героі звязаны кроўна-сваяцкімі сувязямі.

Генеалогія ўзаемазвязана з касмагоніяй, паколькі з'яўленне першых істот пачынаецца са змроку і хаосу, калі не было яшчэ нічога, акрамя цемры і пустэчы. Напрыклад, у скандынаўскай міфалогіі самыя першыя жывыя істоты – карова Аўдумла і волат Імір, з ім разам з'явіліся з лёду дванаццаць патокаў – Элівагар, праз якія ідзе пачатак жыцця. З салёных камянёў, што лізала карова Аўдумла, з'явіўся першачалавек, продак багоў – Буры. Ад яго пачаўся радавод скандынаўскіх дэміургаў. Ад яго сына Бора нарадзіліся трое сыноў – багі Вілі, Ве і вярхоўны бог скандынаваў – Одзін (адно з яго імёнаў Усебацька) [9, с. 27]. Ад вярхоўнага бога Одзіна працягваюць нараджацца сыны: бог маланак і грому, уладальнік молата Мьёльнір Тор, бог вясны Бальдр і яго брат сляпы Хёд, багі помсты Валі і Відар, вартаўнік багоў (што трубіць у рог) – Хеймдаль, бог вайны і заступнік ваяроў Цюр. Дэміургі, якія паходзяць ад Одзіна, завуцца асы. Бог ветру – Ньёрд і яго дзеці (бог сонца Фрэйр, багіня любові і вайны Фрэя) адносяцца да ванаў. Локі, адначасова бог агню, падступства і падману, паходзіць ад нашчадкаў Іміра – волата Фарбаўці і валатоўны Лаўвеі, таксама спараджае пачвар – валадарку скандынаўскага пекла Хель, вялізнага ваўка Фенрыра і змея-цмока Ёрмунганда. Ператвараючыся ў іншых зямных істот, Локі ў вобразе кабылы ад каня Свадзільфары спарадзіў васьміногага каня Слейпніра, на якім ездзіць Усебацька Одзін [4, с. 316].

Ад дзяцей Одзіна ідзе працяг радаводу дэміургаў. Напрыклад, ад бога вясны Бальдра і яго жонкі – багіні радасці і супакою Наны паходзіць бог-суддзя Фарсці, які выносіць прысуды вінаватым у злачынствах і судзіў таксама Локі за забойства свайго бацькі рукамі сляпога Хёда. Ад грамабоя Тора працягваюць радавод бог ваяўнічай лютасці Модзі і бог фізічнай сілы Магні. Менавіта яны разам з уваскрэшанымі Бальдрам і Хёдам успадкуюць ад сваіх бацькоў уладу над новым, адроджаным светам.

У агульнаславянскай міфалогіі бог Род з'яўляецца адначасова стваральнікам свету і першабогам. Ад яго паходзяць два браты – Белбог (бог дабра) і Чарнабог (бог зла), і адначасова

супернікі ў барацьбе і змаганні паміж дабром і злом [5, с. 112]. Таксама аднымі з сыноў Рода ў славянскай міфалогіі з’яўляюцца бог падземнага царства, заступнік жывёл і земляробаў Вялес, бог ветру Стрыбог і бог агню і каваль Сварог, таксама вярхоўны бог беларусаў [Там жа, с. 121]. Ад Сварога паходзяць старэйшы сын Пярун, бог маланак і грому, бог вясны Ярыла, Дажбог – бог Сонца [Там жа, с. 94]. У грамабоя Перуна ёсць жонка – багіня лета Цётка Грамаўніца. Багіня любові Лада – маці Перуна, багіні вясны Лёлі, багіні зімы і смерці Мары, багіні жыцця, долі і лета Жывы. Чарнабог, як і скандынаўскі Локі, спараджае зло. Ад Чарнабога і казы Сядуні паходзіць бог славянскага пекла, карнік грэшнікаў – Вій.

Усталяванне кроўна-сваяцкіх сувязей – галоўная задача ў генеалагічнай міфалогіі. Праз генеалогію ў беларускіх і скандынаўскіх міфах даследуецца паходжанне кожнага дэміурга ад тых багоў, што з’явіліся раней за яго. Шляхам генеалагічных міфаў у любой міфалогіі рэканструююць бацькоў кожнага дэміурга, першапродкаў, якія з’яўляліся яшчэ падчас пачатку стварэння свету. Вывучаючы радаслоўную, генеалог даследуе гістарычны выток (прадзед і праўнук, некалькі пакаленняў, прадстаўнікі роду, праўнук Бог, які паходзіць ад першапродка – мяжы волі да ўлады).

Вядомыя даследчыкі генеалогіі – нямецкі філосаф Фрыдрых Ніцшэ і французскі філосаф Мішэль Фуко, які стварае генеалогію ўлады, абапіраючыся на генеалогію Ніцшэ [7]. Фуко прызнае, што змена і перадача ўлады ствараюць прастору, дзе ўзнікаюць дыскурсы. Генеалогія прасочвае гісторыю самой улады. Характэрным для генеалагічнага метаду Ніцшэ выступае аб’ект альбо ўлада аб’екта, паходжанне якога раскрываецца.

Напрыклад, да генеалогіі ўлады ў скандынаўскай міфалогіі адносяцца Усебацька пантэона дэміургаў і герояў на зямлі, валадар Вальхалы – Одзін, багі і багіні, якія кіруюць часткамі прыроды і інш.: зімой (Уль), вясной (Бальдр), летам і сонцам (Фрэйр), ветрам (Ньёрд), маланкамі і громам (Тор), пачуццём любові (Фрэя), лёсам (тры багіні-норны), шлюбам і дзетанараджэннем (Фрыг – жонка Одзіна), зямлёй (Ёрд – маці Тора), вайной і перамогай (Одзін і яго сын Цюр), ваяўнічай лютасцю ў бітве (Модзі – сын Тора), агнём (Локі), правасуддзем (Фарсеці), скандынаўскім пеклам (Хель). У грамадзе вікінгаў

на зямлі да генеалогіі ўлады адносяцца скандынаўскія кіраўнікі – ярлы і конунгі [4, с. 442]. Пасля смерці конунга (правадыра вікінгаў) улада пераходзіць да яго сына, затым ад сына да ўнука і так з пакалення ў пакаленне.

У беларускай і славянскай міфалогіі прыкладна так жа да генеалогіі ўлады адносяцца багі і багіні, якія кіруюць прыродай і ўсім жывым на зямлі – восенню (Жыцень), зімой (Зюзя), вясной (Ярыла і Лёля), летам (Купала), ветрам (Стрыбог), сонцам (Дажбог), лёсам (Мокаш), лёсам і дзетанараджэннем (ражаніцы, дочкі першабога – Рода), пахавальным агнём (Зніч), падземным агнём (Жыжаль), хатнім гаспадарствам і жывёламі (Вялес), маланкай і громам, княжацкай дружынай (Пярун), агнём (Сварог). У славянскай грамадзе да генеалогіі ўлады маюць дачыненне князі, якія кіруюць рознымі славянскімі плямёнамі і княствамі [5, с. 44]. Пасля смерці князя ўлада пераходзіць таксама да яго сына. Напрыклад, у полацкім княстве Ізяслаў і яго нашчадкі – князі Барыс і Глеб, Усяслаў Чарадзей і яго ўнучка Ефрасіння (Еўфрасіння) Полацкая – вядуць свой радавод ад Рагвалода і Рагнеды, і такім чынам ідзе працяг дынастыі Рагвалодавічаў.

Звязваючы генеалогію з этыкай, Фуко стварае генеалогію этычнага суб’екта, месца ў якой займае ідэя «клопату аб самім сабе» [2]. Прыкладна такі клопат аб сабе ў этычнай генеалогіі маюць скандынаўскія вікінгі: яны здзяйсняюць набегі на заходнееўрапейскія дзяржавы, рабуюць захопленыя каралеўствы. З аднаго боку, вікінгі праслаўляюць саміх сябе вайсковымі паходамі, а з іншага – клапоцячыся аб сабе, яны ўзбагачаюць нарабаваным Скандынавію, што была дагэтуль беднай. Сваё непадабенства да іншых вікінгі і славянскія плямёны, сярод якіх продкі беларусаў (крывічы-палачане, дрыгавічы, радзімічы), адчуваюць, перакананыя ў паходжанні ад язычніцкіх багоў, чымі нашчадкамі сябе бачаць.

Паколькі скандынаўскія багі такія ж смяротныя, як людзі: многім наканавана загінуць у Рагнарок, апошні дзень бітвы з волатамі і пачварамі, і толькі некаторыя з іх перажывуць канец старога свету і нараджэнне новага, ад загінуўшых багоў дзеці і ўнукі таксама ўспадкуюць уладу. Пасля гібелі ранняга свету скандынаваў, вярнуўшыся да жыцця са змрочнага царства Хель, бог вясны Бальдр будзе кіраваць новым, адроджаным светам, выконваючы функцыі свайго бацькі Одзіна, які разам з

сынам – грамабоем Торам і многімі багамі загіне ў апошняй бітве з волатамі. Модзі і Магні ўспадкуюць ад Тора молат Мьёльнір, працягваючы кіраваць громам і маланкамі, як бацька. Валі і Відар – багі помсты, што ацалелі і таксама перажылі скандынаўскі апакаліпсіс, таксама будуць уладарыць з Бальдрам, Хёдам, Модзі і Магні. У новым скандынаўскім свеце ад іх працягнецца радавод Тора і Одзіна і іх першапродкаў – Бора і Буры [8, с. 207].

Характэрнай функцыяй генеалагічнага метаду Фуко і Ніцшэ выступае таксама ўлада, аналіз яе паходжання. У ніцшэанскай генеалогіі з дапамогай вывучэння радаводу даследуецца гістарычны выток, напрыклад праўнук-Бог, які паходзіць ад «прадзеда-першапродка» [2], як усе скандынаўскія дэміургі паходзяць ад Буры – бацькі Бора, дзеда Одзіна. Ніцшэ падкрэслівае, што прадзеда і праўнука раздзяляе пара пакаленняў, што прынеслі змены ў свеце, але пры гэтым застаюцца прадстаўнікамі аднаго роду.

Генеалогія, на погляд філосафа Ніцшэ, – гэта радавод у вобразе дрэва, што ідзе сваімі каранямі глыбока пад зямлю, і навука аб паходжанні роду-дрэва, яго ўнутраных кроўных сувязях. Шукаць паходжанне – значыць спрабаваць знайсці тое, што было раней [6, с. 10]. Да генеалогіі Ніцшэ Фуко далучае метад, звязаны з паняццем «паходжанне», праз які даследуецца паходжанне беларускіх і скандынаўскіх дэміургаў. Спасылаючыся на працу Ніцшэ «Генеалогія маралі», Фуко лічыць «паходжанне» і «прыналежнасць» важнейшымі часткамі генеалогіі. Калі паходжаннем займаецца гісторыя, то пошукам крыніц паходжання і вынікам – генеалогія. Згодна пазіцыі Фуко, генеалогія не імкнецца павярнуць час назад і не ставіць перад сабой задачу паказаць, што мінулае ўсё яшчэ пануе і жыве ў сучасным, а наадварот, яе мэта – утрыманне таго, што было ў мінулым. Пры гэтым генеалогія падхоплівае гістарычныя падзеі.

Адна з мэт генеалогіі – пераацэньванне ўсіх каштоўнасцей і поглядаў у дачыненні да каштоўнасцей, якімі кіруюцца сёння. Старыя каштоўнасці, на якіх заснаваны беларуская і скандынаўская культуры, маюць уплыў язычніцтва. Менавіта беларускі філосаф Ігнат Канчэўскі (Абдзіраловіч) падкрэслівае ў творы «Адвечным шляхам», што наш народ, нягледзячы на

уплыў заходняй і ўсходняй культур, застаецца адданым язычніцкім традыцыям [1].

Генеалог, на думку Фуко, гледзячы на старыя традыцыі і каштоўнасці, стварае пры гэтым новыя [2, с. 11]. Такім чынам, генеалогія – гэта адначасова і вывучэнне старога, і стварэнне новага. Працягваючы ідэю Ніцшэ, Фуко будуе «генеалагічны метад».

Аснова генеалогіі, паводле Фуко, – разуменне радавой памяці, бо яна фарміруе чалавечую свядомасць. Памяць роду – старажытная, з часоў з'яўлення, і адна з найбольш важных рыс культуры, звязаная з генеалогіяй. Пры рэканструкцыі генеалогіі ў беларускай і скандынаўскай міфалогіі рэканструюецца язычніцкая культура, што вызначае менталітэт народаў.


*1. Абдзіраловіч, І.* Адвечным шляхам [Электронны рэсурс] / І. Абдзіраловіч. – Рэжым доступу: https://knihi.com/Ihnat_Kanceuski/Adviecnym_slacham.html. – Дата доступу: 29.11.2022.

*2.* Проект генеалогии: от «генеалогии морали» Ницше к «генеалогии этики» Фуко [Электронный ресурс]. – Режим доступа: https://cyberleninka.ru/article/n/proekt-genealogii-ot-genealogii-morali-nitsshe-k-genealogii-etiki-fuko. – Дата доступа: 29.11.2022.

*3. Родионов, Т.* Генеалогия христианства Ф. Ницше [Электронный ресурс] / Тарас Родионов. – Режим доступа: https://www.topos.ru/article/ontologicheskie-progulki/genealogiya-hristianstva-f-nicshe. – Дата доступа: 29.11.2022.

*4. Сванидзе, А. А.* Викинги – люди саги: жизнь и нравы / Аделаида Анатольевна Сванидзе. – М. : Новое литературное обозрение, 2014. – 800 с.

*5. Фаминцын, Ал. С.* Божества древних славян / Александр Сергеевич Фаминцын. – СПб. : Академический Проект : Гаудеамус, 2012. – 315 с.

*6. Фуко, М.* Археология знания / М. Фуко ; пер. с фр. С. Митина, Д. Стасова ; общ. ред. Бр. Левченко. – Киев : Ника-Центр, 1996. – 208 с.

*7. Фуко, М.* Ницше, генеалогия и история [Электронный ресурс] / М. Фуко. – Режим доступа: https://nietzsche.ru/look/xxb/fuko/. – Дата доступа: 29.11.2022.

*8.* Эда. Песні пра багоў / уклад., пер. са старажытнаісл., камент. Яўгена Папакуля. – Мінск : Галіяфы, 2021. – 312 с.

*9.* Эда Сноры Стурлусана / уклад., пер. са старажытнаісл., камент. Яўгена Папакуля. – Мінск : Галіяфы, 2021. – 298 с.